

# Канвенцыя Савета Еўропы аб супраць-дзеянні гандлю людзьмі

## Механізм маніторынгу

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE



# ЯКІЯ МЭТЫ Ў КАНВЕНЦЫІ?

Канвенцыя Савета Еўропы аб супрацьдзеянні гандлю людзьмі, якая ўступіла ў сілу 1 лютага 2008 года, накіравана на прадухіленне гандлю чалавечымі істотамі, абарону ахвяр і пераслед гандляроў людзьмі. Яна ахоплівае ўсе віды гандлю людзьмі (будзь то нацыянальныя або транснацыянальныя, звязаныя з арганізаванай злачыннасцю ці не), і тычыцца ўсех ахвяраў гандлю людзьмі (жанчын, мужчын і дзяцей), а таксама ўсіх формаў эксплуатацыі. Канвенцыя таксама ўключае меры па развіцці партнёрства з грамадзянскай супольнасцю і міжнароднага супрацоўніцтва.

Асноўная дабаўленая вартасць Канвенцыі – у яе акцэнце на правы чалавека і абарону ахвяраў. Канвенцыя вызначае гандаль людзьмі як парушэнне правоў чалавека і замах на годнасць і цэласнасць чалавечай асобы. Гэта азначае, што нацыянальныя ўлады нясуць адказнасць, калі яны не прынялі мераў да прадухілення гандлю людзьмі, абароны ахвяр і не змаглі эфектыўна расследаваць выпадкі гандлю людзьмі.

Гандаль чалавечымі істотамі – сусветная з'ява, якая не ведае межаў, таму Канвенцыя актуальная для краінаў ва ўсім свеце і з'яўляецца адкрытай да іх ўсіх.



# ЯКІМ ЧЫНАМ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА МАНІТОРЫНГ ВЫКАНАННЯ КАНВЕНЦЫІ?

Канвенцыя стварае незалежны механізм маніторынгу для ацэнкі таго, наколькі добра яе палажэнні выконваюцца на практыцы. Гэты механізм кантролю, які разглядаецца як адзін з моцных бакоў Канвенцыі, складаецца з двух асноўных элементаў: Група экспертаў па барацьбе з гандлем людзьмі (Group of Experts on Action against Trafficking in Human Beings – GRETA) і Камітэт бакоў.

## Што такое GRETA?

Група экспертаў па барацьбе з гандлем людзьмі (GRETA) адказвае за ацэнку выканання Канвенцыі краінамі, якія ратыфікавалі яе. GRETA складаецца з 15 незалежных і непрадузятых экспертаў з краін-удзельніц. Гэта – эксперты з розных сфераў (юрысты, супрацоўнікі праваахоўных органаў, псіхолагі, лекары, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці і г.д.), і адбіраюцца яны на падставе іх прафесійнага вопыту ў галінах, ахопліваемых Канвенцыяй. Тэрмін паўнамоцтваў членаў GRETA складае чатыры гады з магчымасцю аднаразовага перавыбрання.

## Як GRETA выконвае сваю працу па маніторынгу?

Дзейнасць GRETA па маніторынгу дзеліцца на раунды. У пачатку кожнага раунда GRETA вызначае тыя палажэнні Канвенцыі, якія павінны кантралявацца і абірае найбольш прыдатны спосаб правядзення ацэнкі.

Пры выкананні сваёй працы па маніторынгу, GRETA выкарыстоўвае розныя метады збору інфармацыі. У якасці першага кроку GRETA пасылае апытальнік да ўладаў краіны, якая праходзіць ацэнку. Інфармацыя, прадстаўленая ў адказ, аналізуецца экспертамі GRETA, і, калі неабходна, GRETA запытвае дадатковую інфармацыю для ўдакладнення або дапаўнення адказу.

У дадатак да адпраўкі анкеты, эксперты GRETA наведваюць адпаведную краіну. Такія візіты дазваляюць праводзіць паглыбленае абмеркаванне з прадстаўнікамі ўрада, паліцыі, пракурорамі, парламентарыямі і іншымі зацікаўленымі бакамі.

Ацэначныя візіты таксама даюць магчымасць экспертам GRETA наведваць аб'екты, дзе аказваецца дапамога ахвярам гандлю людзьмі. Такім чынам, GRETA можа запытаць дазвол наведаць крызісныя цэнтры ці прытулкі для ахвяраў гандлю людзьмі, якія кіруюцца дзяржаўнымі органамі або няўрадавымі арганізацыямі, цэнтры для нерэгулярных мігрантаў або асоб, якія шукаюць прытулку, памежныя пункты ці бальніцы. Гэтыя візіты дазваляюць правяраць эфектыўнасць мераў, прынятых дзеля выканання Канвенцыі.



# РОЛЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Важнай крыніцай інфармацыі для GRETA з'яўляецца грамадзянская супольнасць. Падчас ацэнкавых наведванняў эксперты GRETA праводзяць сустрэчы з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый (НУА) і іншымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці (напрыклад, з прафсаюзамі, асацыяцыямі адвакатаў, прадстаўнікамі навуковых колаў), якія супрадзейнічаюць гандлю людзьмі. GRETA можа прыняць рашэнне аб накіраванні сваёй анкеты або любога іншага запыту аб прадастаўленні інфармацыі ў адрас НУА і іншых прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якія маюць доступ да надзейных крыніц інфармацыі і магчымасць праверыць гэтую інфармацыю па меры неабходнасці.

# ДАКЛАДЫ GRETA

Ацэнкавыя краінавыя даклады GRETA змяшчаюць аналіз сітуацыі ў кожнай краіне ў дачыненні да мераў, прынятых для барацьбы з гандлем чалавечымі істотамі, і прапановы аб тым, як лепей выконваць Канвенцыю. Гэтыя даклады рыхтуюцца ў духу супрацоўніцтва і прызначаныя для аказання дапамогі дзяржавам у іх намаганнях.

GRETA разглядае праекты ацэнкавых дакладаў на сваіх пленарных пасяджэннях. Праекты дакладаў потым накіроўваюцца адпаведным урадам для каментароў, якія прымаюцца да ўвагі экспертамі GRETA пры складанні свайго канчатковага дакладу. Гэты канчатковы даклад перадаецца ўстановам улады, якім прапануецца прадставіць свае канчатковыя заўвагі. Потым даклад GRETA выдаецца разам з любымі каментарамі з боку ўладаў.

# КАМІТЭТ БАКОЎ КАНВЕНЦЫІ

Другі кампанент механізму маніторынгу – Камітэт бакоў – складаецца з нацыянальных прадстаўнікоў краін, якія ратыфікавалі Канвенцыю. На аснове дакладаў GRETA Камітэт бакоў можа прымаць рэкамендацыі, адрасаваныя асобным краінам, якія тычацца мер, якія павінны быць прынятыя для ажыццяўлення высноў GRETA.



# АД МАНІТОРЫНГУ ДА ПАДТРЫМКІ ВЫКАНАННЯ

Значэнне працы па маніторынгу, якая праводзіцца па Канвенцыі Савета Еўропы аб супрацьдзеянні гандлю людзьмі, складаецца з трох частак:

- яна дапамагае ацаніць вынікі і стымулюе выкананне далёка ідучых абавязацельстваў па Канвенцыі;
- яна забяспечвае індывідуальнае кіраўніцтва аб тым, як пераадольваць перашкоды, і
- яна дае доступ да форуму міжнароднага супрацоўніцтва, дзе можна атрымаць інфармацыю, пазычыць перадавыя практыкі і даведацца пра новыя тэндэнцыі сярод міжнароднай супольнасці, тым самым стымулюючы сумесныя дзеянні па вырашэнні праблемаў.

Вынікі гэтай працы па маніторынгу даступныя ў фармаце «онлайн» і сталі своеасаблівым дапаможнікам для ўсіх, хто ўдзельнічае ў барацьбе з гандлем чалавечымі істотамі. Савет Еўропы таксама аказвае падтрымку ўрадам у рэалізацыі Канвенцыі і рэкамендацый, якія вынікаюць з працэсу маніторынгу.

## Для кантактаў і дадатковай інфармацыі:


Сакратарыят Канвенцыі Савета Еўропы аб супрацьдзеянні гандлю людзьмі (GRETA і Камітэт бакоў)
Савет Еўропы / Council of Europe
F-67075 Strasbourg Cedex
Францыя / France
E-mail: Trafficking@coe.int


www.coe.int/trafficking


THB–INF (2013)1



PREMS 235513 – BEL – © Council of Europe – Photo credit: Council of Europe / Shutterstock